**Б.В.Нічкоў, прафесар**
**Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі**

# ПАРАМЕТРЫ АТЭСТАЦЫІ ПЕДАГАГІЧНАЙ ПРАКТЫКІ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ ДУХАВОГА МАСТАЦТВА ВЫШЭЙШАЙ КВАЛІФІКАЦЫІ

Сярод прафілюючых дысцыплін, тэарэтычных і практычных курсаў педагагічная практыка займае важнае масца ў складаным прафесійным комплексе шматграннага працэсу падрыхтоўкі будучых спецыялістаў духавога мастацтва. Веданне гісторыі музычнай педагогікі і методыкі навучання ігры на духавых інструментах, вывучэнне асаблівасцей нацыянальнай і сусветных выканальніцкіх школ дазваляюць ажыццяўдяць у розных музычных навучальных установах Беларусі якасную падрыхтоўку спецыялістаў. Таму галоўная задача педагагічнай практыкі — даць студэнтам практычныя навыкі, неабходныя для самастойнай педагагічнай работы ў спецыяльных музычных навучальных установах рэспублікі. Удасканальваючы ў спецыяльным класе выканальніцкія навыкі, атрыманыя ў перыяд навучання ў сярэдняй музычнай навучальнай установе, студэнту неабходна навучыцца прымяняць іх на практыцы з комплекснымі ведамі па курсе методыкі навучання ігры на духавых інструментах, а таксама прадметаў музычна-тэарэтычнага і псіхолага-педагагічнага цыклаў.

Тэарэтычны і практычны курс педагагічнай практыкі павінен садзейнічаць развіццю цікавасці будучых спецыялістаў да педагагічнай дзейнасці і навукова-метадычнай работы ў галіне музычнай педагогікі.

Праходжанне педагагічнай практыкі студэнтамі садзейнічае:

— кваліфікаванай арыентацыі ў пытаннях фарміравання неабходнага педагагічнага рэпертуару для сярэдніх спецыяльных музычных навучальных устаноў па сваім класе;

— уменню выканаць твор на інструменце і паказаць роз-

ныя выканальніцкія прыёмы навучэнцаў з адпаведнымі аптымальнымі педагагічнымі, тэхналагічнымі і метадычнымі каментарыямі і тлумачэннямі;

— мастацтвазнаўчаму і педагагічнаму аналізу музычнага твора з мэтай вызначэння яго мастацкіх асаблівасцей, тэхнічных цяжкасцей і спосабаў іх пераадолення, стылістыкі;

— паспяховаму вырашэнню ансамблевых цяжкасцей і добраму веданню фартэпіяннага суправаджэння;

— складанню індывідуальнага плана навучэнца, улічваючы асаблівасці яго характару, ступень музычнай таленавітасці і выканальніцкай падрыхтоўкі;

— аператыўнай ліквідацыі памылак і адхіленняў ад агульнапрынятых выканальніцкіх нормаў, якія ўзнікаюць у навучэнца;

— дыферэнцыраванаму падбору навучальна-педагагічнага рэпертуару, які дапаможа развіваць моцныя бакі навучэнца, а таксама пераадольваць слабыя;

— метадычна пісьменна весці сістэматычную работу над развіццём усіх відаў тэхнікі;

— навучанню вучня правільна і прадукцыйна выконваць увесь аб'ём хатняга задання;

— сістэматычнаму развіццю навыкаў ансамблевай ігры і ўдасканальванню чытання нот з ліста як неабходных кампанентаў будучага аркестравага музыканта;

— уменню правільна афармляць неабходную вучэбную дакументацыю.

Педагагічная практыка можа быць двух відаў: 1) актыўная і 2) пасіўная. Значэнне абодвух відаў практыкі вялікае. Толькі прысутнічаючы на ўроках вядучых выкладчыкаў-духавікоў, студэнту можна выпрацаваць уласны крытэрый да педагагічнай практыкі, якая ў далейшым з пасіўнай пяройдзе ў актыўную. Вельмі карысна праводзіць урок з вучнем пад наглядам вопытнага выкладчыка з наступным разборам правядзення канкрэтнага ўрока. Гэтая форма з'яўляецца адной з самых важных у фарміраванні музыканта-педагога, і яе трэба прымяняць на ўсім працягу практыкі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Педагагічная практыка студэнтаў музычных вышэйшых навучальных установ праводзіцца ў адпаведнасці з вучэбным планам.

Базамі педагагічнай практыкі могуць быць сярэднія спецыяльныя музычныя навучальныя ўстановы, ДМШ, сектары практыкі пры навучальных установах і інш.

Пажадана мець для адзінага кіраўніцтва кіраўніка практыкі на аддзяленні духавых інструментаў. Уся яго работа павінна праводзіцца ў кантакце з выкладчыкамі па спецыяльнасці і выкладчыкам курса методыкі навучання ігры на інструменце.

У Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі з 1999/2000 навучальнага года студэнтам-духавікам адводзіцца 70 гадзін (на IV курсе 35 і на V таксама 35). Да гэтага навучальнага года студэнтам III курса адводзіцца дадаткова 12 гадзін у другім паўгоддзі, але паводле прапановы кафедраў драўляных і медных духавых і ўдарных інструментаў савет ВНУ іх адмяніў.

Пры правядзенні экзамену па педагагічнай практыцы члены камісіі асабліва звяртаюць увагу на:

1) інтанацыю (не прапускаць на ўроку ніводнай фальшывай ноты пры ігры вучня, сістэматычна дабівацца чысціні інтанацыі);

2) рытмічную дакладнасць (не дазваляць вучню наймалейшых адхіленняў ад выканання нават самых простых рытмічных малюнкаў);

3) выканальніцкае дыханне (сачыць за правільнай пабудовай фраз);

4) дакладнасць выканання ўказаных штрыхоў (не дазваляць іграць нават асобныя ноты штрыхамі, не абазначанымі ў нотах);

5) правільнасць выканання мелізмаў (трэба спачатку папрасіць вучня вывучаць мелодыю без упрыгожанняў);

6) эмацыянальнасць правядзення ўрока ( перажываць разам з вучнем яго поспехі і няўдачы);

7) кантроль за правільнай аплікатурай (пастаянна правя-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

раць аплікатуру, не спадзяючыся на вучня);

8) тое, каб не гаварыць шмат на ўроку пра методыку, а вучыць метадычна правільна (нельга забываць, што вучань прыйшоў на ўрок вучыцца іграць, а не слухаць лекцыі);

9) работу над інструктыўным матэрыялам (абавязковая частка ўрока);

10) правільны падбор рэпертуару (залог поспеху вучня);

11) веданне вучнем італьянскіх тэрмінаў у выконваемай праграме (з'яўляецца абавязковым, бо даецца характар п'есы або твора);

12) дакладнасць і яснасць зробленых заўваг і хатняга задання (поспех да прадукцыйнай работы вучня);

13) веданне выконваемага рэпертуару, а таксама фартэпіяннай партыі канцэртмайстра (з'яўляецца абавязковым для педагога);

14) кантакт выкладчыка і вучня ў час правядзення заняткаў (таксама залог паспяховых заняткаў вучня).

Аднак, правяраючы шмат гадоў работу выкладчыкаў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў і ДМШ рэспублікі, неабходна адзначыць, што, як правіла, яны не ўмеюць кваліфікавана афарміць вучэбную дакументацыю. Практычна іх гэтаму не вучаць пры праходжанні курса педагагічнай практыкі. Бывае, што характарыстыкі не адлюстроўваюць індывідуальнасць вучня. Не заўсёды педагогі ўмеюць кваліфікавана скласці яе. Некаторыя педагогі неахайна запаўняюць індывідуальныя планы, пішуць неразборліва і дапускаюць граматычныя і стылістычныя памылкі.

Усе гэтыя недахопы сведчаць аб тым, што індывідуальныя планы часта складаюцца ў спешцы, аднастайна, трафарэтна. Педагогі не прадумваюць праграму для сваіх вучняў, не ўказваюць іх слабыя бакі і шляхі іх пераадолення. А загадчыкі цыклавых камісій падыходзяць да гэтага фармальна, падпісваюць, не чытаючы навучальна-справаздачную дакументацыю. Не абмяркоўваюцца індывідуальныя планы навучэнцаў і на пасяджэнні аддзяленняў. Асабліва ў цяжкае становішча трапляе новы педагог, які прымае клас, бо

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

па такіх характарыстыках немагчыма ўявіць прафесійныя магчымасці вучняў.

Такім чынам, якаснае складанне індывідуальнага плана навучэнца і яго ажыццяўленне — неабходныя кампаненты прафесійнага майстэрства, якому неабходна вучыць на ўсім працягу навучання студэнта па педагагічнай практыцы. Таму правільна пастаўленая педагагічная практыка ў музычных навучальных установах, яе прынцыповая атэстацыя — залог паспяховай далейшай падрыхтоўкі маладых выкладчыкаў і прафесійных выканаўцаў на духавых інструментах у краіне.

**Н.Г.Огурцов,**
**профессор Белорусского университета культуры**

## ПСИХОЛОГО-ПЕДАГОГИЧЕСКИЕ ПРОБЛЕМЫ ОРГАНИЗАЦИИ ПРАКТИКИ СТУДЕНТОВ УНИВЕРСИТЕТА

В последние годы происходят значительные изменения в деятельности высшей школы: создаются новые типы учебных заведений, вводятся новые специальности, меняются цели и содержание образования. Предприняты меры для введения стандартов в деятельность высшей школы. Такие изменения потребовали разработки новых технологий педагогического взаимодействия, перехода к новой педагогике. Серьезные шаги в этом направлении уже сделаны. Появились научные работы, учебные пособия, учебники по педагогике и психологии высшей школы, в которых проблемы обучения и воспитания студентов решаются на качественно новом уровне. Важно подчеркнуть, что этот уровень обеспечивает успешную подготовку студентов к профессиональной деятельности на основе единства и взаимосвязи специальных, психолого-педагогических, методических знаний и способов деятельности, закономерностей формирования личности. Для создания новых педагогических технологий педагогика высшей школы



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ